Спорт-тайм

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ЯК РЭПЕТЫЦЫЯ ГУЛЬНЯЎ-2019

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» традыцыйна расказваем пра самыя актуальныя падзеі выхадных.

1. ***Беларускі занялі 5-е месца на маладзёжным (U-23) чэмпіянаце свету па баскетболе 3х3 у кітайскім Сіані.*** Адзначым, нашы спартсменкі атрымалі тры перамогі ў папярэдняй групе В, а потым саступілі ў чвэрцьфінале аднагодкам з Расіі з лікам 15:19 і аказаліся на пятай выніковай пазіцыі сярод 20 удзельнікаў турніру.

Чэмпіёнкамі планеты сталі расіянкі, «серабро» ў каманды Японіі, бронзу заваявалі ўкраінкі. У мужчын таксама першынствавалі расійскія баскетбалісты, другое месца ў Латвіі, трэцімі фінішавалі венгры.

У дэбютным для беларусак сусветным першынстве за нацыянальную зборную пад кіраўніцтвам трэнера Юрыя Ваўка гулялі Арына Масько, Настасся Сушчык, Ганна Лапо і Сабіра Агаева.

Нагадаем, што баскетбол 3х3 уваходзіць у праграму II Еўрапейскіх гульняў у Мінску.

2. ***Дзюдаіст Арцём Коласаў заваяваў першую залатую ўзнагароду для беларускай каманды на III летніх юнацкіх Алімпійскіх гульнях у Буэнас-Айрэсе.***

Спартсмен атрымаў перамогу ў вагавой катэгорыі да 55 кілаграмаў, у фінале беларус быў мацнейшы за прадстаўніка Манголіі Цемуджына Ганбургеда, атрымаўшы чыстую перамогу, — «іпон».

«Перамагчы на юнацкай Алімпіядзе — была мая мэта. Сапернікі годныя, асабліва ў фінале. Мангольскі дзюдаіст выдатна мяне выматаў, але я быў лепш настроены. Часта так адбываецца, што перамагае не той, хто мацнейшы тэхнічна, а той, хто настроіцца лепш», — пракаментаваў Арцём Коласаў.

3. ***Баксёр Кірыл Рэліх абараніў тытул чэмпіёна свету па версіі WBA.*** У паядынку беларус па ачках адолеў расіяніна Эдуарда Траяноўскага ў вагавой катэгорыі 63,5 кілаграма.

Нагадаем, сёлета ў сакавіку Рэліх у Лас-Вегасе перамог кубінца Рансеса Бартэлемі і ўпершыню стаў чэмпіёнам свету.

У Сусветнай серыі бокса Рэліх працягне выступленне ў паўфінале. Яго сапернік вызначыцца 27 кастрычніка ў баі паміж Роджысам Прагрэйсам (ЗША) супраць брытанца Тэры Флэнагана. У гэтым турніры выступіць яшчэ адзін беларус, Іван Баранчык, які 27 кастрычніка ў чвэрцьфінале сустрэнецца ў паядынку за тытул чэмпіёна іншай версіі IBF са шведам Энтані Ёгітам.

4. ***Завяршыліся матчы 24-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Мінскае «Дынама» ўпэўнена перайграла «Смалявічы» 2:0, футбалісты «Тарпеда-БелАЗ» разграмілі гродзенскі «Нёман» — 3:0. ***Вынікі астатніх сустрэч:*** «Іслач» — БАТЭ — 2:1, «Тарпеда» (Мінск) — «Мінск» — 1:0, «Гарадзея» — «Прамень» — 1:1, «Дняпро» — «Дынама» (Брэст) — 1:4, «Слуцк» — «Віцебск» — 0:2, «Гомель» — «Шахцёр» — 0:3.

Становішча ў групе лідараў: БАТЭ — 57 ачкоў (23 матчы), «Шахцёр» — 48 (23), «Дынама» (Мінск) — 48 (23), «Віцебск» — 47. Матчы 25-га тура адбудуцца 19—22 кастрычніка.

5. ***Гандбалісты БГК імя Мяшкова прайгралі ў Лізе чэмпіёнаў у дамашнім матчы венгерскаму «Веспрэму» — 28:29.*** Наступны матч у самым прэстыжным клубным турніры мяшкоўцы правядуць 13 кастрычніка. На сваёй пляцоўцы яны прымуць іспанскую «Барселону».

Тым часам мінскі СКА пачаў выступленне ў розыгрышы Кубка ЕГФ. У першым матчы з партугальскім «Порту» армейцы былі слабейшыя за апанента 29:34. Сустрэча ў адказ адбудзецца ў суботу, 13 кастрычніка, у сталічным Палацы спорту.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Даты Падзеі Людзі

9 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

1708 год — у Паўночную вайну 1700-1721 гадоў каля вёскі Лясная (цяпер у Слаўгарадскім раёне) паміж расійскімі войскамі (12 тысяч чалавек, 30 гармат) і шведскім корпусам А. Левенгаўпта (16 тысяч чалавек, 17 гармат) адбылася так званая Лясянская бітва. Расійскімі войскамі камандавалі Пётр I і А. Д. Меншыкаў. Шведскі корпус рухаўся з Ліфляндыі з абозам з 7 тысяч павозак з боепрыпасамі і харчаваннем на злучэнне з асноўнымі сіламі Карла XII. Сустрэўшыся з рускімі войскамі, шведы занялі пазіцыю на паўночны захад ад Лясной, збудаваўшы ў тыле ўмацаванне з калоў. Палову абозу і тры тысячы чалавек Левенгаўпт накіраваў да Прапойска (Слаўгарада). Бітва працягвалася пяць гадзін з пераменным поспехам, аднак шведы былі вымушаныя пакінуць асноўную пазіцыю і адступіць пасля падыходу да рускіх войскаў 4-тысячнага атрада. Левенгаўпт, пакінуўшы параненых, артылерыю і абоз, адышоў да Прапойска, а затым далей уздоўж ракі Сож на поўдзень. Да Карла XII прабілася каля 4 тысяч чалавек. У бітве шведы страцілі больш за восем тысяч, рускія войскі — каля 4 тысяч чалавек.

1863 год — нарадзіўся (г. Масква) Васіль Робертавіч Вільямс, савецкі глебавед, акадэмік НАН Беларусі, Акадэміі навук СССР, УАСГНІЛ. Адзін з заснавальнікаў агранамічнага глебазнаўства. Распрацаваў агранамічныя мерапрыемствы па захаванні і павышэнні ўрадлівасці глеб, травапольную сістэму земляробства. Аўтар каля 470 навуковых прац. Памёр у 1939 годзе.

1898 год — нарадзіўся (г. Лунінец) Аляксандр Васілевіч Петрушэўскі — савецкі ваеначальнік, генерал-палкоўнік, Герой Савецкага Саюза. У 1938—1941 гадах — намеснік начальніка штаба Беларускай (Заходняй) ваеннай акругі. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1941 года на Цэнтральным, Бранскім, 1-м, 2-м і 3-м Украінскіх франтах — начальнік штаба арміі, камандзір корпуса, камандуючы арміяй. Удзельнік Маскоўскай, Курскай бітваў, Варонежска-Касторненскай, Чарнігаўска-Прыпяцкай, Жытомірска-Бярдзічэўскай, Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Будапешцкай, Балатонскай і Венскай аперацый. Стралковы корпус пад яго камандаваннем вызначыўся падчас прарыву абароны праціўніка на паўночны захад ад горада Ясы. Да 1960 года — у Савецкай Арміі. Памёр у 1976 годзе.

У свеце

1451 год — нарадзіўся Хрыстафор Калумб, іспанскі мараплавец і адкрывальнік новых зямель. Да гэтага часу шэсць гарадоў Італіі і Іспаніі аспрэчваюць права быць яго радзімай. Вакол многіх падзей яго жыцця выраслі легенды, развянчаць якія і да гэтага часу не цалкам атрымалася.

1888 год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Бухарын, савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, эканаміст, філосаф, акадэмік АН СССР (1929). Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гадоў і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. У 1918—1929 гадах рэдактар газеты «Правда». Выступаў разам з І. В. Сталіным супраць Л. Д. Троцкага, Л. Б. Каменева, Р. Я. Зіноўева. У 1934—1937-м — рэдактар газеты «Известия». Адстойваў палітыку «ваеннага камунізму», падтрымліваў асноўныя напрамкі нэпа. У канцы 1920-х выступаў супраць прымянення надзвычайных мер пры правядзенні калектывізацыі і індустрыялізацыі, што было абвешчана «правым ухілам у ВКП (б)». У 1938 годзе неабгрунтавана рэпрэсаваны па справе «праватрацкісцкага антысавецкага блока». Рэабілітаваны пасмяротна.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.28	18.24	10.56
Віцебск —	7.19	18.13	10.54
Магілёў —	7.18	18.15	10.57
Гомель —	7.13	18.13	11.00
Гродна —	7.43	18.40	10.57
Брэст —	7.41	18.42	11.01

Месяц

Маладзік у 6.47.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Івана, Уладзіміра, Ціхана, Яфрэма.*
К. *Анастасіі, Арнольда, Багдана, Вінцэнта, Людвіка, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Прыйшла ў госці да знаёмых. У іх каля дзвярэй дыванок, на ім напісана: «Уяві, што я твой былы!» Так старанна я ногі ніколі не выцірала.

На сумоўі:

— Назавіце вашы моцныя бакі.

— Настойлівасць!

— Дзякуй, мы звяжамся з вамі.

— Я пачакаю тут.

І хто гэта прыдумаў, што з жанчынамі складана?

Падышоў, абняў, сказаў, што прыгожая, разумная. Калі зусім нічога ў галаву не лезе, спытай:

— Я не зразумеў, ты пахудзела, ці што?

Які сэнс ісці на работу, калі мы ўсе памром, а праз некалькі мільярдаў гадоў Сонца спаліць Зямлю? Так і напішу ў тлумачальнай.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3776.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 кастрычніка 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12